***Чайка Н.У.***

# СІНТАКСІЧНАЯ ДЭРЫВАЦЫЯ Ў БЕЛАРУСКАЙ МОВЕ

*Беларускі дзяржаўны медыцынскі ўніверсітэт*
*Мінск, Беларусь*

**Анатацыя**. Артыкул прысвечаны аналізу ўзроўню распрацоўкі сінтаксічнай дэрывацыі ў мовазнаўстве. У публікацыі прадстаўлены сінтаксічныя школы і напрамкі, што вывучалі названае пытанне, а таксама метадалагічныя прынцыпы даследавання.

*Ключавыя словы: сінтаксічныя дэрываты, структурна-сінтаксічныя мадыфікацыі, вытворныя канструкцыі, сінтаксічная кампрэсія, эліпсіс.*

***Chayka N.U.***

# SYNTACTIC DERIVATION IN THE BELARUSIAN LANGUAGE

*Belarusian State Medical University*
*Minsk, Belarus*

**Abstract**. The article is dedicated to the analysis of syntactic derivation development layer in linguistics. Methodological research principles, syntactic schools and ways that studied this issue are represented in the article.

*Keywords: syntactic derivatives, structure-syntactic modifications, syntactic compression, ellipsis.*

Развіццё сінтаксічнай сістэмы беларускай мовы на сучасным этапе выклікала значнае пашырэнне адзінак дынамічнага сінтаксісу: канструкцый з эліпсісам дзеяслова, парцэляваных канструкцый, канструкцый з імпліцытнай семантыкай, з сінтаксічнай рэдукцыяй і кампрэсіяй, вытворных канструкцый, выкарыстанне якіх падпарадкавана ўніверсальным філасофскім законам актуалізацыі неабходнай інфармацыі. Антрапацэнтрычны характар сучасных моўных працэсаў выклікаў тэндэнцыю да ўдасканалення механізмаў рэгулявання моўнай сістэмы, што паўплывала на карэляцыю паміж развіццём мыслення і матэрыяльнымі сродкамі яго выражэння. У сувязі з гэтым тыпалагічнае апісанне адзінак дынамічнага сінтаксісу з выяўленнем спецыфікі моўных з'яў і заканамернасцей іх функцыянавання стала адным з прыярытэтных напрамкаў айчыннага і замежнага мовазнаўства.

Адным са складаных і актуальных феноменаў дынамічнага сінтаксісу з'яўляецца эліпсіс. Названая праблема не толькі не вырашана на сённяшні дзень, лічыць І. І. Дзягавец, але і заблытана да такой ступені, што практычна нельга адмежаваць эліптычны сказ ад іншай структурна-сінтаксічнай мадыфікацыі з апорай на прапанаваныя лінгвістамі крытэрыі. Прадстаўнікі ***логіка-граматычнай*** школы трактавалі эліпсіс як пропуск кампанента лагічнага суджэння. У гэтым выпадку пад з'яву эліпсіса падпадалі канструкцыі з сінтаксічным нулём або нават сказы з іменным выказнікам. Прыхільнікі ***псіхалагічнай школы*** разглядалі сказы безадносна да структуры як цэласныя ўяўленні пра аб'екты рэчаіснасці. У працах

Репозиторий БГМУ

прадстаўнікоў ***структурнага сінтаксісу*** мадыфікаванымі прызнаваліся канструкцыі, дзе меўся пропуск структурна значнага элемента ў параўнанні з інварыянтам. У межах ***семантычнай сінтаксічнай школы*** непаўната разумелася як сціранне ці замена нулём на паверхневай структуры сказа тых ці іншых элементаў яго глыбіннай структуры. Даследчыкі адносілі эліпсіс да варыятыўных адрозненняў паміж сінтаксічнымі адзінкамі на той падставе, што названая з’ява закранае толькі план выражэння сказа У канцэпцыях прадстаўнікоў ***функцыянальнай школы*** сінтаксічныя мадыфікацыі вылучаўся ў асобную сінтаксічную катэгорыю, а эліптычныя канструкцыі лічыліся структурна поўнымі, паколькі, на іх думку, выконвалі камунікатыўную функцыю. Аб’ектам вывучэння большасці прадстаўнікоў гэтай школы былі сінтаксічныя канструкцыі, аб’яднаныя адзінствам семантычнай функцыі.

Стракатасць і супярэчлівасць канцэпцый сведчаць пра неабходнасць якасна новага падыходу да аналізу з’яў дынамічнага сінтаксісу, які адпавядаў бы накіраванасці навуковага пазнання новага часу, адлюстроўваў сутнасць сінтаксічных з’яў і заканамернасці іх функцыянавання з улікам антрапацэнтрычнага характару сінтаксічных працэсаў.

Узяўшы за аснову інтэграваную канцэпцыю структурнага і функцыянальна-семантычнага сінтаксісу, да сінтаксічных дэрыватаў мы адносім канструкцыі з пропускам дзеяслоўнага выказніка, з імпліцытнай семантыкай, рэдукцыяй, кампрэсіяй і далучэннем.

Найбольш мэтазгодным і прадуктыўным лічым сінхронны тыпалагічны аналіз названых з’яў у сінтаксічнай сістэме беларускай мовы. Сучасныя канцэпцыі сінтаксічных тыпалогій – кантэнсіўная (Г. П. Мельнікаў), парадку слоў (А. У. Цымерлінг), лінейнай паслядоўнасці ў сінтагмах (Л. Тэньер), граматыка-структурная (А. Я. Кібрык), семантыка-дыстрыбутыўная (С. Кароляк), сінтактыка-семантычная (М. Н. Азімава), статальна-дынамічнай антыноміі (І. А. Неўская), структурна-граматычная (М. Энсці), структурна-семантычная (І. І. Дзягавец), логіка-сінтаксічная (Н. У. Князева), семантыка-граматычная (С. Кіціл), тыпалогія семантычных адносін (Т. М. Андрэева), семантыка-сінтаксічная (Э. Томпсан) – заснаваны на характары класа аб’ектаў. Аднак тыпалогія канструкцый з эліпсісам дзеяслова ў названых працах не даследавалася.

Актуальнасць падобных даследаванняў абумоўлена адсутнасцю ў лінгвістычнай літаратуры канцэптуальнага апісання сінтаксічнай дэрывацыі ў сучаснай беларускай мове з вызначэннем тэарэтычных асноў і метадалагічных прынцыпаў даследавання гэтай з’явы. Важна выявіць кваліфікацыйныя, класіфікацыйныя і сістэмаўтваральныя параметры для аналізу і ўпарадкавання названых канструкцый. Такі падыход дазволіць ахарактарызаваць аналізуемыя з’явы ў адпаведнасці са спосабамі эксплікацыі структурных і семантычных катэгорый прэдыката, зрабіць іх класіфікацыю і кампенсаторных сродкаў у іх.

Літаратура

1. Мельников, Г. П. Системная типология языков: принципы, методы, модели / Г. П . Мельников ; Рос. акад. наук, Ин-т языкознания. – М. : Наука, 2003. – 393 с.



Репозиторий БГМУ

2. Циммерлинг, А. В. Типологический синтаксис скандинавских языков / А. В. Циммерлинг. – М. : Яз. славян. культуры, 2002. – 895 с.

3. Теньер, Л. Основы структурного синтаксиса / Л. Теньер ; пер. с фр. И.М. Богуславского [и др.] ; общ. ред. В. Г. Гака. – М. : Прогресс, 1988. – 653 с.

4. Кибрик, А. Е. Константы и переменные языка / А. Е. Кибрик ; Моск. гос. ун-т, Филол. фак. – СПб. : Алетейя, 2005. – 719 с.

5. Karolak, S. O założeniach składniowo-semantycznego opisu języków naturalnych / S. Karolak // Studia z Filologii Pol. i Słowiańskiej / Pol. Acad. Nauk, Inst. Slawistyki. – 2004. – T. 39. – S. 219–228.

6. Азимова, М. Н. Сопоставительно-типологический анализ фразеологической системы таджикского и английского языков : автореф. дис. … д-ра филол. наук : 10.02.20 / М. Н. Азимова ; Рос.-Таджик. ун-т. – Душанбе, 2006. – 49 с.

7. Невская, И. А. Типология локативных конструкций в тюркских языках Южной Сибири: на материале шорского языка : автореф. дис. ... д-ра филол. наук : 10.02.02 / И. А. Невская ; Рос. акад. наук, Ин-т филологии. – Новосибирск, 1997. – 45 с.

8. Anstey, M. P. Functional discourse grammar – multifunctional problems and constructional solutions / M. P. Anstey // Linguistics. – 2008. – Vol. 46, Iss. 4. – P. 831–859.

9. Дяговец, И. И. Типология русских придаточных предложений нетипичного построения: синтаксические единицы с отклоняющейся структурой : автореф. дис. … д-ра филол. наук : 10.02.01 / И. И. Дяговец ; Моск. гос. ун-т. – М., 2006. – 30 с.

10. Князева, Н. В. Семантико-синтаксические типы предложений с предикативным ядром N1-N1 : автореф. дис. ... канд. филол. наук : 10.02.01 / Н. В. Князева ; Дальневост. гос. ун-т. – Владивосток, 2006. – 22 с.

11. Kittil, S. A typology of tritransitives: alignment types and motivations / S. Kittil // Linguistics. – 2007. – Vol. 45, Iss. 3. – P. 453–508.

12. Андреева, Е. Г. Сопоставительный анализ моделей глагольного управления в русском и английском языках : автореф. дис. ... канд. филол. наук : 10.02.19 / Е. Г. Андреева ; Ленингр. гос. ун-т. – Л., 1991. – 17 с.

13. Thompson, E. Temporal dependency and the syntax of subjects / E. Thompson// J. of Linguistics. – 2001. – Vol. 37, № 2. – P. 287–312.

Репозиторий БГМУ